Пралетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 271 (340)
НЯДЗЕЛЯ
24
ЛІСТАПАДА
1940 г.

Цана 10 капеек.

Учора адкрылася абласная канферэнцыя МОПР

Учора, у 8 гадзін увечары, адкрылася першая аб'яднаная абласная і гарадская канферэнцыя МОПР Беластоцкай вобласці.

На канферэнцыю прыбыла да моманту яе адкрыцця 230 дэлегатаў, прадстаўляючых 46 тысяч членаў МОПР.

У склад прэзідыума выбрана 35 чалавек, у тым ліку сакратары Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б, кіруючыя работнікі МОПР, лепшыя мопраўскія актывісты фабрык, заводаў і калгасаў.

Пад гром апладысментаў і воклічы: «ура!» выбіраецца ў склад ганаровага прэзідыума Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышам Сталіным, а таксама таварышы Дзімітраў і Тэльман.

Доўга незмаўкаючай авацыяй канферэнцыя прымае прывітальную тэлеграму таварышу Сталіну.

Дакладчыкам па першаму пункту павесткі дня аб рабоце абкома і гаркома МОПР выступіла старшыня абкома МОПР тав. Рэгіна Каплан.

Работа канферэнцыі працягваецца.

КОМУНІСТЫ, НАСТОЙЛІВА АВАЛОДВАЙЦЕ ВАЕННЫМІ ВЕДАМІ!

Комуністы, асабліва партыйны актыў, павінны быць застрэльшчыкамі авалодання шырокімі і дасканалымі ваеннымі ведамі. Практычна гутарка ідзе аб тым, каб кожны комуніст, комсамолец авалодаў адной, двума ваеннымі спецыяльнасцямі.

Гэта асабліва важна ў сучасны момант, калі міжнародная абстаноўка вельмі складаная, заблытаная і тоіць у сабе многа нечаканасцей. Другая імперыялістычная вайна ахапіла ўжо больш паловы зямнога шара і пагражае ператварыцца ў сусветную.

Ні на адну мінуту нельга забываць указання таварыша Сталіна аб тым, што «Неабходна ўвесь наш народ трымаць у стане мабілізацыйнай гатоўнасці перад тварам небяспекі ваеннага нападу, каб ніякая «выпадковасць» і ніякія фокусы нашых знешніх ворагаў не маглі засцігнуць нас знянацку».

Кожны грамадзянін нашай краіны заўсёды гатоў па першаму заклiку партыі і ўрада стаць на абарону сваёй любімай радзімы. У гэтым ярка праяўляецца патрыятызм совецкіх людзей. Каб з поспехам выканаць свой высокі абавязак, неабходна добра ўладаць ваеннымі ведамі, умела карыстацца багацейшай тэхнікай, якой аснашчана наша доблесная Чырвоная Армія. У выпадку, калі вораг пасмее парушыць нашы граніцы, Чырвоная Армія будзе самай наступальнай арміяй у свеце.

Комуніст, а тым больш партыйны актывіст, работнік партыйнага апарата, павінен нястомна клапаціцца аб павышэнні ваенных ведаў шырокай масы працоўных. З гэтай задачай ён справіцца толькі тады, калі сам будзе добра адукаваным у ваенных адносінах чалавекам.

Адказныя партыйныя, совецкія, гаспадарчыя работнікі—гэта ў большасці камандзіры і палітработнікі запаса. Задача заключаецца ў тым, каб іх ваенныя веды былі на ўзроўні сучасных патрабаванняў.

У апошні час абкомы, гаркомы, райкомы партыі прынялі рад мер па арганізацыі ваеннай вучобы партыйнага актыва. Добрую ініцыятыву праявіў Мінскі абком КП(б)Б, яго ваенны аддзел. Скарыстаўшы вопыт Ленінградскай партыйнай арганізацыі, ваенны аддзел распрацаваў стацыянарную праграму заняткаў партыйнага актыва, разлічаную на 130 гадзін. Партыйны актывіст, згодна гэтай праграмы, атрымае належныя веды ў галіне стралковай справы, ваеннай тактыкі, тапаграфіі, партыйна-палітычнай работы ў Чырвонай Арміі. Заняткі павінны быць максімальна набліжаны да ваенна-палявых умоў.

Горрайкомы г. Мінска, а таксама большасць сельскіх райкомаў КП(б)Б ужо арганізавалі заняткі згодна новай праграмы. Актыў праяўляе да заняткаў выключна вялікую цікавасць. Пры Барысаўскім гаркоме партыі ваенную вучобу праходзяць 65 актывістаў, сярод іх 20 сакратароў пярвічных арганізацый. Праведзена ўжо 7 заняткаў. Сур'ёзна падышлі да арганізацыі вучобы партыйнага актыва Старобінскі і Лагойскі РК КП(б)Б. У гэтых партарганізацыях актыў прайшоў ужо значную частку праграмы.

Арганізаваў ваенную вучобу актыва і Гомельскі гарком партыі. Вучобай ахоплена 500 чалавек: работнікі абкома, гаркома і горрайкомаў КП(б)Б, сакратары пярвічных партарганізацый. Праграма разлічана на 170 гадзін. Яна ўключае страявую, агнявую, тактычную падрыхтоўку і іншыя ваенныя дысцыпліны.

Вельмі каштоўна тое, што ў радзе раёнаў сакратары РК КП(б)Б, з'яўляючыся камандзірамі запаса, асабіста кіруюць ваеннымі заняткамі. Так, сакратар Капаткевіцкага райкома партыі т. Штэйнбах выкладае адну з ваенных дысцыплін. Не трэба даказваць, што актыўны ўдзел сакратароў райкомаў партыі і іншых кіруючых работнікаў раёнаў—камандзіраў запаса або палітработнікаў у арганізацыі ваеннай вучобы самым станоўчым чынам адаб'ецца на яе якасці, забяспечыць з самага пачатку сур'ёзныя адносіны да заняткаў з боку ўсіх комуністаў.

Трэба адзначыць яшчэ адно каштоўнае пачынанне ваеннага аддзела Палескага абкома партыі. Побач з рэгулярнымі ваеннымі заняткамі па праграме ён пачаў арганізоўваць лекцыі і даклады на розныя ваенныя тэмы: гісторыю войн, значэнне і ўзаемадзеянне розных родаў войск і т. д. Такія лекцыі чытаюцца больш падрыхтаванымі камандзірамі запаса з партыйнага актыва ў парткабінетах, дамах соцкультуры. Актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні лекцый прымаюць таксама аддзелы прапаганды і агітацыі райкомаў.

Ваенная вучоба партыйнага актыва—важнейшая партыйная справа. Яна патрабуе да сябе максімальнай увагі. Ні ў якім разе нельга дапусціць абыякавых адносін да яе з чыйго-б там ні было боку. Між тым, ёсць яшчэ партыйныя кіраўнікі, партыйныя актывісты, якія лёгкадумна адносяцца да ваеннай вучобы.

Настойліва і ўпорна вывучаць ваенную справу—пярвейшы абавязак кожнага комуніста, кожнага партыйнага, совецкага, гаспадарчага кіраўніка.

(З перадавой «Звязды» ад 22 лістапада г. г.).

Прэзідыуму Вярхоўнага Совета Армянскай ССР

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР віншуе рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыю, усіх працоўных Армянскай ССР з 20-годдзем устанаўлення Совецкай улады ў Арменіі.

Дваццаць год таму назад рабочыя і сяляне Арменіі пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі зверглі контррэволюцыйны ўрад дашнакоў і устанавілі совецкую ўладу.

Перамога соцыялістычнай рэволюцыі паклала канец нацыянальнаму прыгнечанню, бяспраўю, пагромам і міжнацыянальнай рэзне, адкрыўшы працоўным Арменіі шырокі шлях да нацыянальнага адраджэння, гаспадарчага і культурнага росквіту.

Дзякуючы няўхільнаму правядзенню ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, Арменія ператварылася ў квітнеючую соцыялістычную рэспубліку. Створаны новыя галіны прамысловасці: хімічная, машынабудаўніцтва, тэкстыльна-трыкатажная і іншыя. Атрымалі далейшае развіццё вінаробчаская і кансэрвная прамысловасць. Пабудаван рад гідраэлектрастанцый, паспяхова ажыццяўляецца буйнейшае будаўніцтва Севана-Зангінскага каскада гідрастанцый — асновы для далейшага развіцця новых электраёмкіх галін прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Шырокае будаўніцтва ірыгацыйных збудаванняў, прымяненне сучаснай сельскагаспадарчай тэхнікі ператварылі Арменію ў рэспубліку высокай ураджайнасці зерневых і тэхнічных культур і прадукцыйнай жывёлагадоўлі. Атрымала далейшае, больш шырокае развіццё вінаградарства, бавоўнаводства і садаводства.

Поспехі ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы забяспечылі няўхільны рост матэрыяльнага дабрабыту; шырока развітая сетка тэхнікумаў і вузаў забяспечвае нацыянальнымі кадрамі прамысловасць і сельскую гаспадарку.

Прашоўшая дэкада армянскага мастацтва ў Маскве прадэманстравала шырокі ўзровень развіцця нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу культуры армянскага народа.

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР выражае поўную ўпэўненасць у тым, што працоўныя армянскай ССР даб'юцца яшчэ большых поспехаў на фронце гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, забяспечаць далейшае ўмацаванне абароннай магутнасці краіны і сумесна з усімі народамі Совецкага Саюза пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і вялікага Сталіна пойдуць па шляху к комунізму.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета
М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета.
А. ГОРКІН

—«о»—

Вечар брацкай дружбы Украінскага і Грузінскага народаў

КІЕЎ. У сталіцы краіны адбылася сустрэча кіраўнікоў КП(б)У і ўрада УССР з дэлегацыяй грузінскага народа, наведаўшай усходнія і заходнія вобласці Украіны. На сустрэчы прысутнічалі члены ЦК КП(б)У, дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і УССР, кіраўнікі абласной і гарадской партыйнай арганізацыі, народныя камісары, буйнейшыя дзеячы навукі, літаратуры і мастацтва.

Паяўленне ў зале Н. С. Хрушчова было сустрэта бурнай, доўга не змаўкаючай авацыяй. З велізарным усхваляваннем гаварылі дэлегаты аб уражанні, якое на іх зрабіла Украіна, яе выдатныя калгасы, яе гіганцкія заводы, а галоўнае — яе народ, вялікі, свабодалюбівы украінскі народ — магутная апора на захадзе 193-мільённага совецкага народа.

„СУВОРАЎ І ЯГО ЧАС“
ВЫСТАЎКА ДЗЯРЖАЎНАГА ГІСТАРЫЧНАГА МУЗЕЯ.

24 лістапада спаўняецца 210 год са дня нараджэння вялікага рускага палкаводца А. В. Суворава. Дзяржаўны гістарычны музей адзначае гэту памятную дату стварэннем выстаўкі «Суворaў і яго час».

Дакументальныя экспанаты расказваюць аб беззаветнай храбрасці і ваенным геніі А. В. Суворава, аб гістарычных перамогах рускай арміі, атрыманых пад яго кіраўніцтвам. На выстаўцы будуць прадстаўлены ўзоры рускага аружжа таго часу.

(ТАСС).

Рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты Беластоцкага гарадского Совета дэпутатаў працоўных

21. Па акрузе **№ 114** зарэгістрыраван Міхаіл Ільіч **Гімпельсон,** 1910 г. нараджэння, беспартыйны, дырэктар 6-га тэкстыльнага камбіната, вылучаны калектывам 6-га камбіната.

22. Па акрузе **№ 67** зарэгістравана Тайба Хаімаўна **Слапак,** 1910 г. нараджэння, беспартыйная, работніца-краўчыха, вылучаная калектывам швейнай фабрыкі «Атэлье мод».

23. Па акрузе **№ 197** зарэгістраван Стэфан Васільевіч **Остасевіч,** 1886 г. нараджэння, беспартыйны, машыніст, вылучаны калектывам паравознага дэпо Беластоцкага аддзялення чыгункі.

24. Па акрузе **№ 94** зарэгістрыраван Ісак Абрамавіч **Гелер,** 1904 г. нараджэння, беспартыйны, ткач 13-га камбіната, вылучаны калектывам 13-га камбіната.

25. Па акрузе **№ 184** зарэгістрыраван Барыс Іванавіч **Раманаў,** 1911 г. нараджэння, член ВКП(б), намеснік начальніка палітаддзела Беластоцкага аддзялення чыгункі, вылучаны калектывам работнікаў Беластоцкага аддзялення і палітаддзела аддзялення чыгункі.

26. Па акрузе **№ 42** зарэгістраван Сяргей Сяргеевіч **Рацькоў,** 1909 г. нараджэння, член ВКП(б), загадчык оргінструктарскім аддзелам гаркома КП(б)Б, вылучаны калектывам фабрыкі № 17.

27. Па акрузе **№ 121** зарэгістраван Гаўрыіл Іванавіч **Сямёнаў,** 1900 г. нараджэння, член ВКП(б), сакратар абкома партыі, вылучаны сходам прафесарска-выкладчыцкага, студэнцкага і тэхнічнага персанала педінстытута.

28. Па акрузе **№ 66** зарэгістраван Нахман Абрамавіч **Крамаж,** 1904 г. нараджэння, беспартыйны, загадчык сталовай фабрыкі «Атэлье мод», вылучаны калектывам фабрыкі «Атэлье мод».

29. Па акрузе **№ 74** зарэгістраван Іосіф Мартынавіч **Радзішэўскі,** 1882 г. нараджэння, беспартыйны, сушыльшчык 1-га камбіната, вылучаны калектывам 1-га камбіната.

30. Па акрузе **№ 87** зарэгістравана Ядвіга Антонаўна **Шыдлоўская,** 1912 г. нараджэння, беспартыйная, прысучальшчыца 23-й фабрыкі, вылучаная калектывам 23-й фабрыкі.

31. Па акрузе **№ 148** зарэгістраван Мечыслаў Каетанавіч **Кавальскі,** 1911 г. нараджэння, беспартыйны, слесар ваціна-ватнай фабрыкі, вылучаны калектывам ваціна-ватнай фабрыкі № 32.

32. Па акрузе **№ 209** зарэгістравана Фаня Абрамаўна **Цэгельніцкая,** 1906 г. нараджэння, беспартыйная, старшыня профсаюза медсанпрацы, вылучаная калектывам работнікаў 1, 4 і 5-й паліклінік.

33. Па акрузе **№ 46** зарэгістравана Еўгенія Сяргееўна **Антоненка,** 1906 г. нараджэння, беспартыйная, начальнік апаратна-прадзільнага цэха, вылучаная калектывам 4-га камбіната.

34. Па акрузе **№ 152** зарэгістравана Хава Янкелеўна **Каменьман,** 1919 г. нараджэння, член ВЛКСМ, старшая матальшчыца ткацкага цэха, вылучаная калектывам 29-й фабрыкі.

35. Па акрузе **№ 47** зарэгістраван Іосіф Іосіфавіч **Галецкі,** 1907 года нараджэння, беспартыйны, змесаўшчык 4-га камбіната, вылучаны калектывам 4-га камбіната.

36. Па акрузе **№ 113** зарэгістраван Віталій Раманавіч **Раманаў,** 1905 г. нараджэння, член ВКП(б), сакратар гаркома КП(б)Б, вылучаны калектывам 7-га камбіната.

37. Па акрузе **№ 149** зарэгістрыраван Шолам Янкелевіч **Шварц,** 1901 г. нараджэння, беспартыйны, начальнік цэха маслазавода, вылучаны калектывам трэста «Белраc-масла».

38. Па акрузе **№ 43** зарэгістравана Аксенія Кірылаўна **Андрэюк,** 1905 г. нараджэння, беспартыйная, насцільшчыца на апаратах, вылучаная калектывам фабрыкі № 27.

39. Па акрузе **№ 111** зарэгістраван Зігмунд Эдуардавіч **Пшыбыляк,** 1912 г. нараджэння, беспартыйны, рабочы 6-га камбіната, вылучаны калектывам 6-га камбіната.

40. Па акрузе **№154** зарэгістраван Павел Александравіч **Самахвалаў,** 1900 г. нараджэння, член ВКП(б), ваенком горада Беластока, вылучаны калектывам маслабойнага завода.

41. Па акрузе **№ 71** зарэгістравана Зоф'я Мартынаўна **Стоцкая,** 1912 г. нараджэння, беспартыйная, сакрэтчыца 1-га тэкстыльнага камбіната, вылучаная калектывам камбіната.

42. Па акрузе **№ 30** зарэгістравана Елена Іосіфаўна **Длугаш,** 1900 г. нараджэння, беспартыйная, работніца сушыльнага цэха фанернага завода № 7, вылучаная калектывам фанернага завода.

43. Па акрузе **№ 213** зарэгістраван Нікалай Фёдаравіч **Ніканаў,** 1897 г. нараджэння, член ВКП(б) з 1928 г., намеснік начальніка Беластоцкай чыгункі, вылучаны калектывам упраўлення чыгункі.

У апошнюю гадзіну

Далучэнне Румыніі к пакту трох дзяржаў

БЕРЛІН, 23 лістапада. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае наступнае паведамленне: 23 лістапада міністр замежных спраў Германіі Рыбентроп, дырэктар палітычнага дэпартамента міністэрства замежных спраў Італіі Буці і японскі пасол у Берліне Курусу, з аднаго боку, і прэм'ер-міністр Румыніі генерал Антанеску, з другога боку, падпісалі ў Берліне пратакол аб далучэнні Румыніі да пакта трох дзяржаў, заключанага 27 верасня 1940 года паміж Германіяй, Італіяй і Японіяй.

Камюніке грэчаскага вярхоўнага камандавання

АФІНЫ, 23 лістапада. (ТАСС). Грэчаскае тэлеграфнае агенцтва перадае камюніке грэчаскага вярхоўнага камандавання, апублікаванае ўчора ўвечары: «На працягу 22 лістапада нашы войскі закончылі захват горнага раёна Морава, захват Іван-гары і ўшчэлля Карыт. Корча ўзята. На поўдзень, у сектары Пінда, нашы войскі занялі Лесковікі і прасунуліся за Эрсеке і Бораве. У Эпіры нашы войскі зноў занялі горад Філіатэс і адкінулі праціўніка за межы граніцы. Наша авіяцыя бамбардыравала калоны адступаючага праціўніка, не гледзячы на актыўныя дзеянні авіяцыі праціўніка. Захоплены палонныя і ваеннае снаражэнне».

АМЕРЫКАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ АБ БАМБАРДЫРОЎЦЫ АНГЛІЙСКІХ ГАРАДОЎ

НЬЮ-ЙОРК, 23 лістапада. (ТАСС) Лонданскі карэспандэнт газеты «Нью-Йорк геральд трыбюн», які наведаў 22 лістапада адзін з гарадоў цэнтральнай часткі Англіі (відавочна, Бірмінгам), паведамляе, што гэты горад не падвергся такім разбурэнням, як Кавентры. Прамысловыя прадпрыемствы, відавочна, атрымалі невялікія пашкоджанні; чыгуначная станцыя поўнасцю функцыяніруе, хаця знаходзячыяся радам буйныя будынкі, у якіх змяшчаліся дзелавыя канторы, моцна пацярпелі. Бамбардыроўцы падвергліся галоўным чынам рабочыя раёны.

Лонданскі карэспандэнт газеты «Нью-Йорк таймс» паведамляе, што бамбардыроўка германскай авіяцыяй у ноч на 23 лістапада двух гарадоў у цэнтральнай частцы Англіі прычыніла значны ўрон, хаця яго нельга параўнаць з уронам, які быў прычынен Кавентры ў час бамбардыроўкі ў мінулым тыдні. Не паступіла ніякіх звестак, піша карэспандэнт, аб уроне, прычыненым ваенным аб'ектам.

Па Совецкай краіне

НОВЫ СПІСАК «ДЭМАНА»

ЛЕНІНГРАД. Навуковаму супрацоўніку Ленінградскай Публічнай бібліятэкі імені Салтыкова-Шчэдрына, А. Н. Міхайлавай удалося адшукаць спісак паэмы Лермантава «Дэман», з якога рабіўся набор замежнага выдання паэмы у 1856 годзе ў Карлсруэ.

Спісак гэты быў у свой час звернут друкарняй выдаўцу паэмы А. І. Філасофаву, які прывёз яго ў Расію. Разам з другімі паперамі выдаўца ён паступіў у архіў народнай гаспадаркі.

Не гледзячы на амаль векавую даўнасць, спісак «Дэмана» выдатна захаваўся. Рукой выдаўца ў яго ўнесены папраўкі Лермантава, зробленыя ім для шостай, прадапошняй, рэдакцыі паэмы.

ШКОЛЬНІКІ ВЫЙГРАЛІ АЎТАМАБІЛЬ

Вучні 3-га класа Мічурынскай школы № 13 (Тамбоўская вобласць), купіўшыя ў складчыну трохрублёвы білет 14-й латарэі Асоавіяхіма, выйгралі легкавую машыну або 10.000 грашыма. Яны рашылі атрымаць выйгрыш грашыма і дзве тысячы з іх перадаць у фонд абароны краіны, дзве тысячы на абсталяванне піонерскага пакоя і шэсць тысяч — на набыццё ваенных вучэбных дапаможнікаў для яго.

(ТАСС).



Выгляд будаўніцтва Палаца Советаў (Масква). Фота М. Рунова.

Фота ТАСС.

«ДЗЕНЬ НАШАГА ЖЫЦЦЯ»

РАСТОЎ-НА-ДАНУ. Растоўскае абласное выдавецтва выпускае днямі кнігу «Дзень нашага жыцця». У ёй сабраны нарысы, артыкулы, заметкі, пісьмы, дакументы, прысвечаныя здарэнням аднаго дня ў Растоўскай вобласці—15 мая 1940 года. Аўтары кнігі—рабочыя, калгаснікі, інжынеры, партыйныя, совецкія і гаспадарчыя работнікі, артысты, студэнты. Яны расказваюць аб сваёй рабоце і адпачынку, аб шчаслівым, заможным і культурным жыцці гарадоў і станіц Дона.

РЭКОРД ЗАБОЙШЧЫКА ПАСТАНОГАВА

КІЗЕЛ. Забойшчык шахты «Піонер» тав. Пастаногаў, працуючы па метаду вядомага крыварожскага буршчыка Семівалоса, дабіўся новага вытворчага поспеху. За 8 гадзін ён абурыў тры забоі, прайшоўшы 6 пагонных метраў. Зменнае заданне тав. Пастаногаў выканаў на 662 проценты. Уключыўшыся ў спаборніцтва з шахцёрамі камбіната «Растоў вугаль», ён абавязаўся ў бліжэйшыя дні праходзіць за змену 8—9 метраў.

НАБОРНАЯ МАШЫНА ДЛЯ СЛЯПЫХ

КІЕЎ. (ТАСС). Кіеўскі завод паліграфічнага абсталявання асвоіў выраб наборнай машыны для сляпых. Працэс набору нескладаны. Спецыяльны ліст белай бляхі закладаецца сляпым наборшчыкам у жалезную раму. Затым пад дыктоўку, націскаючы кнопкі, ён выбівае на лісце точаныя знакі, якія азначаюць літары, лічбы і т. д. Бляха ператвараецца такім чынам у матрыцу, устаўляецца ў друкарскую машыну і пры друкаванні пакідае на паперы выпуклы тэкст. Машына дазволіць павялічыць выпуск літаратуры для сляпых.

Выпушчаны першыя 10 такіх машын. Яны адпраўляюцца ва Узбекістан, Грузію, Арменію, Ленінград і іншыя раёны краіны.

СКАРАСНАЯ АЎТАДРЭЗІНА

Калужскі машынабудаўнічы завод Наркамата шляхоў зносін распрацаваў праект і пабудаваў у гэтым годзе першы вопытны ўзор скараснай аўтадрэзіны. Яна развівае хуткасць да 90 кілометраў у гадзіну. Хуткасць дзейнічаючых дрэзін — 50 кілометраў.

Машына разлічана на 14 чалавек. У бліжэйшы час будзе наладжан серыйны выпуск яе.

КАНДЫДАТЫ Ў ДЭПУТАТЫ АБЛАСНОГА СОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Выбаршчыкі Паўднёва-Ўсходняй выбарчай акругі № 15, г. Ломжы! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Яна Антонавіча ТУРЛЕЙСКАГА!

★ ★ ★

Ян Антонавіч Турлейскі

(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)

У 1913 годзе ў горадзе Лодзі ў сям'і чыгуначнага кандуктара нарадзіўся сын. Назвалі яго Янам.

Прышоў час ісці ў школу. Бацькі хацелі даць сыну-пяршынцу сярэднюю асвету. І вось бацька адвёў сына ў гімназію.

Скромны да крайнасці бюджэт сям'і не вытрымаў новага выдатку, і неаднаразова вучоба зрывалася. Але Ян даганяў таварышоў пасля вымушанага перапынку.

Не адна вучоба захапляла Яна. Ён арганізоўвае ў гурткі бяднейшых гімназістаў, якія пратэстуюць супроць школьнай платы. Гэтыя гурткі вялі таксама барацьбу супроць шавінізма і антысемітызма.

У 1933 годзе Ян Антонавіч быў прынят у варшаўскі політэхнікум. Тут ён з галавой уходзіць у рэвалюцыйную работу і становіцца на чале варшаўскай студэнцкай рэвалюцыйнай арганізацыі.

У 1938 годзе тав. Турлейскага як палітычна нядобранадзейнага выключаюць з політэхнікума і забараняюць закончыць вышэйшую навучальную ўстанову. Дэфензіва думала тэрорам зламіць волю ўпорнага юнака. Аднак, яна памылілася. Тав. Турлейскі ў глыбокім падполлі вядзе рэвалюцыйную работу сярод рабочых Варшавы і Варкі, дзе ён працаваў у пачатку чорнарабочым, а затым— тэхнікам.

21 верасня 1939 года Ян Антонавіч пачуў радасную вестку — Чырвоная Армія ішла вызваляць сваіх братоў працоўных. І польскі салдат Турлейскі (вайна застала яго ў польскай арміі) з радасцю накіроўваецца насустрач Чырвонай Арміі. Сустрэча была ў Ломжы... Якая вялікая, неапісальная была радасць!..

★ ★ ★

Працоўныя Ломжы добра ведаюць Яна Турлейскага, які пачаў працаваць тэхнарукам завода сельгасмашын. Яны выбіраюць яго дэпутатам у Народнае Сабранне Заходняй Беларусі. Як член Паўнамоцнай Камісіі Народнага Сабрання Ян Антонавіч прысутнічаў на V унечарговай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР. Гэта быў самы шчаслівы перыяд у яго жыцці.



Горача гучэлі яго словы пад зводамі Крэмлёўскага палаца, калі ён гаварыў аб любві працоўнага народа, вызваленага ад іга польскіх памешчыкаў і капіталістаў, к партыі большэвікоў, к тварцу самай дэмакратычнай у свеце Канстытуцыі— таварышу Сталіну.

24 сакавіка 1940 года Ян Антонавіч Турлейскі быў выбран дэпутатам Вярхоўнага Совета СССР. Пашырыўся круг абавязкаў, якія ён выконвае з надзвычайнай энергіяй і энтузіязмам. Да яго як да дэпутата Вярхоўнага Совета СССР звяртаюцца дзесяткі, сотні людзей па розных пытаннях. За красавік — кастрычнік месяцы ён атрымаў ад выбаршчыкаў 210 пісем.

Вось характэрныя прыклады, калі ўмяшанне тав. Турлейскага дало добрыя вынікі. На ломжынскай гарадской электрастанцыі сапсаваўся вал рухавіка дынамамашыны. Патрабавалася неадкладная адточка вала. Дырэктар электрастанцыі тав. Борк неаднаразова звяртаўся з гэтым пытаннем да розных арганізацый і прадпрыемстваў, але заўсёды атрымліваў адзін і той-жа адказ: «Вашага заказу прыняць не можам». Тады тав. Борк звярнуўся да тав. Турлейскага, і пры яго садзейнічанні вал рухавіка быў хутка адрамантаваны.

Выконваючы сваю асноўную работу і абавязкі дэпутата, тав. Турлейскі прымае самы актыўны ўдзел у грамадскім жыцці горада і раёна.

Тав. Турлейскі ўпорна авалодвае асновамі марксізма-ленінізма. Акрамя «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» ён вывучае творы Леніна, Сталіна. Ён вывучыў твор Леніна «Дзяржава і рэвалюцыя», кнігу т. Сталіна «Марксізм і нацыянальна-каланіяльнае пытанне».

Малады, энергічны, нястомны ў рабоце тав. Турлейскі стараецца апраўдаць давер'е сваіх выбаршчыкаў.

7-га верасня гэтага года Ян Антонавіч быў вылучан старшынёй Ломжынскага гарадскога выканкома. Клопаты аб упарадкаванні і культуры горада цалкам захапілі яго.

Калі пачалося вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў працоўных, калектыў работнікаў лесазавода № 2 аднадушна вылучыў тав. Турлейскага Яна Антонавіча кандыдатам у дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета дэпутатаў працоўных на Паўднёва-Усходняй выбарчай акрузе № 15.

Тав. Турлейскі вылучан таксама кандыдатам у дэпутаты Ломжынскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных па выбарчай акрузе № 60. Няма сумнення, што тав. Турлейскі з чэсцю апраўдае давер'е сваіх выбаршчыкаў.

Е. Крэснікаў.

Выбаршчыкі Штабінскай выбарчай акругі № 21, Аўгустоўскага раёна! 15 снежня ўсе якадзін аддавайце свае галасы за Станіслава Эдуардавіча РЫБАЛТОЎСКАГА

★ ★ ★

Станіслаў Эдуардавіч Рыбалтоўскі

(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)

Станіслаў Эдуардавіч Рыбалтоўскі прайшоў вялікі шлях жыцця. Ён нарадзіўся ў 1892 годзе ў мястэчку Семятычы, былой Гродненскай губерні, Бельскага павета.

«Вучыцца ў дзяцінстве мяне не аддалі, бо сям'я была вельмі бедная, — піша тав. Рыбалтоўскі ў сваёй аўтабіяграфіі, — і я быў вымушан з ранніх год ісці ў чужыя людзі, пасвіць жывёлу. Колькі зайздрасці таілася ў маёй дзіцячай душы, калі я бачыў дзяцей, ідучых з кнігамі ў школу! 14-гадовым я быў аддадзен у вучні да шаўца. Затым беспрацоўе прымусіла мяне пакінуць мястэчка Семятычы, і я паехаў у Кіеў шукаць заработкаў... Так працягвалася маё цяжкае, бязрадаснае жыццё да 1917 года».

У маі 1917 года тав. Рыбалтоўскі ўступае ў члены партыі большэвікоў. І партыя выхоўвае яго, загартоўвае ў барацьбе, вучыць змагацца, працаваць, кіраваць масамі, весці іх на штурм капіталізма.

У дні Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі 1917 года тав. Рыбалтоўскі выступае ўжо свядомым барацьбітом, арганізатарам мас. Ён член Кіеўскага губернскага аддзела саюза рабочых скураной прамысловасці, начальнік баявой дружыны Кіеўскай абутковай фабрыкі. У момант звяржэння Цэнтральнай Украінскай Рады Станіслаў Эдуардавіч Рыбалтоўскі ўваходзіць у састаў рэўкома Кіеўскага арсенала. Арсенальцы геraічна змагаюцца супроць контррэвалюцыі.

На Кіеў наступаюць немцы і гайдамакі. Станіслаў Эдуардавіч Рыбалтоўскі ідзе на фронт. У першых радах рэвалюцыйнай арміі змагаецца ён за совецкую ўладу, за шчасце народа.

У чэрвені 1918 года партыя пасылае яго ў органы ВЧК у Саратаўскую губерню. У 1919 годзе ён накіроўваецца партыяй на паўднёвы фронт. Потым зноў органы ВЧК, а летам 1920 года — польскі фронт. Мужна і смела змагаецца Станіслаў Эдуардавіч Рыбалтоўскі за вызваленне сваёй радзімы ад насядаючых белапольскіх банд, за вызваленне польскага народа, сынам якога ён з'яўляецца. Хочацца змагацца да поўнай перамогі, не шкадуючы жыцця. З горачму на душы, слязамі на вачах пакідаў Станіслаў родныя месцы Гродненшчыны і Брэстчыны, сваіх сяброў дзяцінства, калі Чырвоная Армія вымушана была адступіць з гэтай тэрыторыі.



Але Станіслаў Эдуардавіч верыў, што ён прыдзе сюды зноў, што не доўга будуць белапольскія банды здзекавацца з народа, смактаць кроў рабочых і сялян — яго землякоў.

І вера гэтая апраўдалася. Доблесная Чырвоная Армія ў 1939 годзе вызваліла Заходнюю Беларусь, вызваліла беларусаў, палякаў, яўрэяў, якія пражываюць на гэтай тэрыторыі, вызваліла роднае Рыбалтоўскаму мястэчка — Семятычы. І цяпер Рыбалтоўскі зноў прышоў сюды, прышоў па волі партыі на пасаду намесніка старшыні Беластоцкага абласнога выканаўчага камітэта, прышоў, каб дапамагчы сваім землякам-рабочым і сялянам будаваць новае жыццё — соцыялізм, каб знішчыць спадчыну капіталізма — забітасць, галечу, бескультур'е...

Пасля скавнчэння грамадзянскай вайны тав. Рыбалтоўскі працаваў на многіх адказных пасадах на Украіне і іншых мясцах. У 1927 годзе партыя пасылае яго вучыцца ў промакадэмію, якую ён канчае ў 1930 годзе і едзе працаваць у горад Смаленск упраўляючым заходнім скураным трэстам. У лютым 1934 года ў Смаленску яго назначаюць старшынёй абласнога ўпраўлення лёгкай прамысловасці, а потым начальнікам інспекцыі наркамата лёгкай прамысловасці СССР.

У 1936 годзе Станіслава Эдуардавіча Рыбалтоўскага накіроўваюць на работу ў БССР. Спачатку ён працуе ўпаўнаважаным наркамата лёгкай прамысловасці СССР пры СНК БССР, а ў студзені 1937 года яго назначаюць намеснікам народнага камісара лёгкай прамысловасці БССР.

Мы гутарым з Станіславам Эдуардавічам у яго кабінеце ў аблвыканкоме. Ён расказвае нам аб сваім жыццёвым шляху. Колькі вялікіх падзей ім перажыта! Станіслаў юнаком пакінуў родныя месцы, а прышоў сюды пажылым ужо чалавекам.

— У маі 1940 года, — гаворыць ён,—я быў у сваіх Семятычах, сустрэўся там з землякамі, з сябрамі дзяцінства. На іх ляжыць след дваццацігадовага зняволення капіталістамі і памешчыкамі. Ніхто з іх за 20 год панавання польскіх паноў не змог выйсці ў людзі, не змог знайсці прымянення сваім здольнасцям. Гэта яшчэ раз гаворыць аб тым, што толькі ў Совецкім Саюзе, дзе знішчан капіталізм, дзе рабочыя і сяляне з'яўляюцца гаспадарамі, магчым рост чалавека, магчыма атрымаць асвету. Толькі цяпер пачалі яны далучацца да жыцця.

Тав. Рыбалтоўскі чэсны і прамы чалавек. Той, хто ведае яго, — любіць яго і паважае. Працоўныя Аўгустоўскага раёна вылучылі яго сваім кандыдатам у дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета дэпутатаў працоўных.

Станіслаў Эдуардавіч Рыбалтоўскі гэта давер'е працоўных прымае з вялікай радасцю і будзе працаваць, не шкадуючы сваіх сіл і здольнасцей, на карысць вялікай справы Леніна—Сталіна, на шчасце народа.

П. Дудо.



Стаханаўцы мопраўскіх брыгад Беластоцкай дзяржаўнай плюшавай фабрыкі. Фота А. Сапіра.

Інтэрнацыянальнае выхаванне працоўных—важнейшая задача

(Да абласной канферэнцыі МОПР'а).

Яшчэ памятны цяжкія мінулыя годы, яшчэ не забылі вызваленыя працоўныя аб турмах, расстрэлах, карных экспедыцыях. Кожная вуліца, плошча з'яўляецца помнікам мінулай барацьбы. На плошчы ў Скідэлі над брацкай магілай партызан, загінуўшых у барацьбе з белапалякамі, рэюць чырвоныя сцягі. Ніколі не забудзецца дэманстрацыя 1933 года індурскіх сялян у Гродне. Памятаюць беластоцкія рабочыя раненых стачачнікаў на Выгодзе, памятаюць супраслеўскі расстрэл, забойства тав. Райхмана ў беластоцкай турме.

І памятаючы аб гэтым, працоўныя нашай вобласці ідуць у рады МОПР'а. Яны лічаць сваім доўгам дапамагаць нашым братам у капіталістычных краінах.

Нянавісць да мінулага, глыбокая ўдзячнасць працоўных заходніх абласцей вялікаму совецкаму народу, большэвіцкай партыі, таварышу Сталіну за вызваленне праяўляецца ў масавым уступленні рабочых, сялян і служачых нашай вобласці ў рады МОПР'а.

Мопраўская арганізацыя ў сучасных умовах мае буйнейшае значэнне. Сваёй работай яна аказвае велізарную дапамогу партыі ў справе інтэрнацыянальнага выхавання мас, у барацьбе з шавінізмам, які ўсе годы сеялі польскі рэакцыйны ўрад і розныя контррэвалюцыйныя партыі.

Для ўтрымання свайго панавання правячым класам былой Польшчы трэба было разбіваць адзінства працоўных. Гэту задачу ажыццяўлялі розныя контррэвалюцыйныя партыі і арганізацыі, як Эндэцыя, Озон, ППС, Бунд, сіяністы, «Стронніцтво людове». Нацкоўванне польскіх сялян на яўрэйскую бедната, пагромы ў Чыжаве, у Скідэлі мелі мэтай адцягнуць працоўнае сялянства ад барацьбы за зямлю, адцягнуць рабочых і сялян ад барацьбы за знішчэнне панавання эксплаататараў.

Шавіністычныя выступленні ў асобных выпадках і зараз праяўляюцца з боку прытаіўшыхся рэштакаў разгромленых контррэвалюцыйных партый. Таму мопраўская арганізацыя пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый павінна ў сваёй рабоце галоўную ўвагу звярнуць на інтэрнацыянальнае выхаванне працоўных мас.

Традыцыі інтэрнацыяналізма праяўляліся ў сумеснай рэвалюцыйнай барацьбе беларускіх і польскіх працоўных, калі беларускія сяляне Брэсцкай вобласці падымаліся на пратэсты, на паўстанні супроць расстрэлу паўстаўшых польскіх сялян у Кракаўскай акрузе ў 1933 годзе, калі польскія рабочыя пратэставалі супроць карных экспедыцый у Заходняй Беларусі.

Мопраўская арганізацыя Беластоцкай вобласці вырасла за 11 месяцаў свайго існавання да 46 тысяч членаў, выканала свой гадавы план датэрмінова больш чым на 150 процантаў, выканала свой фінансавы план на 132 проценты.

Гэтыя лічбы — вынік перш за ўсё масава-інтэрнацыянальнай і выхаваўчай работы. Вось, напрыклад, мопраўская ячэйка 3-га тэкстыльнага камбіната. Яна налічвае 615 членаў з 700 чалавек рабочых. Ячэйка мае 22 зборшчыкі членскіх узносаў, выпусціла 5 нумароў мопраўскіх насценных газет, правяла тры інтэрнацыянальных вечары. У ячэйцы сістэматычна праводзяцца гутаркі і чыткі па цэхах аб пралетарскім інтэрнацыяналізме і на іншыя тэмы. Абсталявана 6 мопраўскіх куткоў. Мопраўцы 3-га тэкстыльнага камбіната зразумелі, што першай задачай сапраўднага інтэрнацыяналіста з'яўляецца работа па ўмацаванню сваёй радзімы — Совецкага Саюза. Таму яны стварылі 8 мопраўскіх стаханаўскіх брыгад. 150 агітатараў вылучаны з мопраўскага актыва для работы на выбарчых участках.

Не адстаюць ад ячэйкі 3-га камбіната і мопраўцы 5-га тэкстыльнага камбіната. Апрача выхаваўчай работы на прадпрыемстве яны праводзяць мопраўскую работу ў 17-й школе, арганізавалі ячэйку МОПР сярод хатніх гаспадынь. Вялікую выхаваўчую работу правяла ячэйка беластоцкага горхарчпромгандлю. Мопраўскім членствам яна ахапіла 50 процантаў работнікаў прылаўка.

Добрым пачынаннем з'яўляецца тое, што рад ячэек не абмяжоўваюцца работай сярод супрацоўнікаў сваёй ўстановы або рабочых прадпрыемства, а праводзяць работу і сярод неарганізаванага насельніцтва. Ячэйка беластоцкага горжылупраўлення, якая налічвае 217 членаў, арганізавала 11 ячэек хатніх гаспадынь, 15 мопраўскіх куткоў пры домаўпраўленнях.

Ёсць асобныя добрыя прыклады ў рабоце і ў вясковых ячэйках.

Мопраўскія арганізацыі прымаюць актыўны ўдзел у соцыялістычным будаўніцтве. У Беластоку ёсць да 30 мопраўскіх стаханаўскіх брыгад імені змагароў рэвалюцыі. Перавыконвае норму брыгада імені Клары Цэткін на 3-м тэкстыльным камбінаце, яна спаборнічае з брыгадай імені Бытомскай — лодзінскай тэкстыльшчыцы, зверска забітай польскімі жандарамі. Ва ўсіх палітычных кампаніях — выбарах у Вярхоўныя Советы, у арганізацыі падпіскі на пазыку і іншых — дзесяткі і сотні мопраўскіх агітатараў пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый праводзілі работу сярод насельніцтва. Зараз мопраўскія арганізацыі актыўна ўключыліся ў кампанію па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. У Беластоку каля 350 актывістаў МОПР'а працуюць на выбарчых участках у якасці агітатараў і членаў камісій, у Ломжы працуюць у выбарчых камісіях да 300 мопраўцаў.

Але разам з тым у мопраўскай рабоце ёсць і рад буйнейшых недахопаў. Горш за ўсё пастаўлена работа ў вёсцы. Раённыя арганізацыйныя бюро МОПР'а недастаткова прыцягвалі мясцовы актыў да работы. У адрозненне ад гарадскіх ячэек Беластока і Гродна мопраўскія ячэйкі ў раёнах слаба вялі інтэрнацыянальна-выхаваўчую работу. Яны абмяжоўваліся ў большай частцы зборам членскіх узносаў. Пры значным росце арганізацыі адсутнічаў належны ўлік саставу арганізацыі і неабходны парадак у мопраўскай гаспадарцы.

Праведзеная справаздачна-выбарчая кампанія мопраўскіх органаў дала вялікія станоўчыя рэзультаты.

За гэтыя дні значна вырасла сама арганізацыя. Але-ж асноўным дасягненнем праведзенай кампаніі трэба лічыць той факт, што ў склад бюро ячэек і бюро райкомаў выбраны працаздольныя актывісты МОПР'а.

Ва ўсёй нашай рабоце вялікую дапамогу нам аказвалі і аказваюць абласны камітэт партыі і мясцовыя партыйныя арганізацыі. Асабліва актыўны ўдзел у арганізацыі дапамогі мопраўскім ячэйкам у апошні час аказваюць сакратар Заблудаўскага райкома КП(б)Б тав. Марголін, сакратары Гродненскага райкома тт. Славінскі і Кавалёў, сакратар Беластоцкага райкома — тав. Арцішэўскі і іншыя таварышы. Аднак трэба адзначыць, што рад партыйных арганізацый вобласці і многія асобныя комуністы ўсё яшчэ недаацэньваюць значэнне мопраўскай работы. Трэба, каб мопраўскай работай у раёнах і гарадах нашай вобласці сістэматычна кіравалі ўсе райкомы і гаркомы КП(б)Б, усе пярвічныя партыйныя арганізацыі.

У нашай рабоце павінен дапамагчы комсамол. У дапамозе комсамольскіх арганізацый мопраўскім ячэйкам за апошні час намецiўся некаторы зрух. Гэта стала прыкметным, напрыклад, у Саколцы, у Гродненскім раёне. Але ўсё-ж трэба адзначыць, што многія нашы комсамольцы яшчэ недаацэньваюць мопраўскую работу сярод моладзі.

Учора пачала і сёння працягвае работу першая аб'яднаная абласная і гарадская Беластоцкая канферэнцыя МОПР'а. Яна, несумненна, наменіць рад канкрэтных мерапрыемстваў перад мопраўцамі нашай вобласці па ажыццяўленню задач, пастаўленых перад абласной арганізацыяй. Асноўнай задачай абласной арганізацыі МОПР і ў далейшым будзе інтэрнацыянальна-выхаваўчая работа, распаўсюджванне вопыту перадавых ячэек. Асаблівую ўвагу ў далейшым на мясцах трэба ўдзяліць рабоце на вёсцы, у школах і сярод неарганізаванага насельніцтва.

Мопраўцы Беластоцкай вобласці павінны памятаць аб тым, што павышэнне прадукцыйнасці працы, умацаванне Совецкага Саюза з'яўляецца найвялікшай задачай, нашым інтэрнацыянальным доўгам перад працоўнымі ўсяго свету. Вопыт работы мопраўскіх стаханаўскіх брыгад павінен быць перанесен у кожнае прадпрыемства, калгас, арцель. Мопраўцы ў вёсцы абавязаны праявіць сябе перадавікамі ва ўсіх палітычных кампаніях, у будаўніцтве калгаснага жыцця. Мопраўцы павінны актыўна ўдзельнічаць у кампаніі па выбарах у мясцовыя Советы. На кожным выбарчым участку трэба арганізаваць мопраўскі куток, правесці інтэрнацыянальны вечар, мопраўскія гутаркі на тэмы аб палітычным бяспраўі працоўных у капіталістычных краінах і т. д.

Ва ўсіх гарадах і раёнах неабходна ахапіць мопраўскі актыў інструкцыйнымі нарадамі і семінарамі. Трэба дапамагчы старшыням, сакратарам ячэек, зборшчыкам членскіх узносаў, бяседчыкам, дакладчыкам у арганізацыі іх работы. Толькі ствараючы шырокі актыў пазаштатных інструктароў школьных, вытворчых і вясковых секцый вакол райкомаў МОПР'а можна ажыццявіць задачу далейшага росту і ўмацавання работы арганізацыі.

Беластоцкая абласная арганізацыя МОПР спаборнічае з Брэсцкай арганізацыяй. Мы ў гэтым спаборніцтве заваявалі першынства. Гэта першынства мы можам утрымаць толькі шляхам разгортвання соцыялістычнага спаборніцтва паміж раёнамі і ячэйкамі.

Выконваючы пастаўленыя перад намі большэвіцкай партыяй задачы па інтэрнацыянальнаму выхаванню працоўных мас, па далейшай актывізацыі мопраўцаў у справе соцыялістычнага будаўніцтва, мы выканаем нашы матэрыяльныя і маральныя абавязкі перад барацьбітамі рэвалюцыі. Пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі мопраўская арганізацыя Беластоцкай вобласці пойдзе ўперад да новых перамог.

Р. Каплан,
старшыня Беластоцкага абкома МОПР'а.

У блакнот агітатару

ГАЛЯРЭЯ ТЫПАЎ БЫЛОЙ БЕЛАСТОЦКАЙ ГАРАДСКОЙ РАДЫ

Крадзеж, хабар і прадажніцтва

У першую гарадскую раду, выбраную ў 1919 годзе, уваходзіла галоўным чынам польская сярэдняя буржуазія — домаўладальнікі, купцы, багатыя падрадчыкі, аптэкары.

Ніколі і нідзе так не квітнелі крадзяжы, хабар і прадажніцтва, як у гэтай радзе. Усе члены магістрата з панам бургамістрам Шыманскім на чале былі проста кушлены замежным капіталам.

Пан Шыманскі, калісьці банкаўскі служачы і прыхільнік партыі так званых прагрэсіўных дэмакратаў, а затым на працягу 9 гадоў бургамістр г. Беластока, адкрывае сваёй асобай багатую галярэю цёмных тыпаў сярод былых «бацькоў» горада Беластока.

Гэта было ў першыя гады існавання «незалежнай» Польшчы. Галовы ўчарашніх дэмакратаў кружыліся ад нечаканай улады. Пан бургамістр Шыманскі ўпраўляў горадам, як шляхціч сваім фальваркам. Ён ездзіў па гораду ў карэце. Магістрацкія кур'еры і прыбіральшчыцы, сустрэўшы пана бургамістра, цалавалі яго (гэтага прагрэсіўнага дэмакрата) у руку. Пан Шыманскі жыў на шырокую нагу, а ў доме яго, па Стара-Баярскай вуліцы № 12, пастаянна адбываліся п'яныя гульні і банкеты. Там аставіўся Пілсудскі, калі першы раз прыехаў у Беласток.

Пан Шыманскі і яго магістрат угробілі комунальную гаспадарку Беластока. Ён разам з усім магістратам прадаўся бельгійскім капіталістам, якія валодалі электрастанцыямі ў радзе гарадоў, у тым ліку і ў Беластоку. Дырэктарам Беластоцкай электрастанцыі быў нейкі пан Рыгерт. Ён быў фактычным дыктатарам Беластока. Ад яго залежала ўся прамысловасць, паколькі ён устанаўліваў цэны за электраэнергію. Яго выбралі старшынёй саюза беластоцкіх фабрыкантаў, ён быў членам Віленскай палаты прамысловасці і гандлю, меў велізарны ўплыў у адпаведным міністэрстве ў Варшаве, а з ваяводамі іграў у карты і пазычаў ім грошы.

Пан Рыгерт проста-напроста купіў беластоцкага бургамістра пана Шыманскага, які праводзіў палітыку, карысную пану Рыгерту і бельгійскім канцэсіянерам Беластоцкай электрастанцыі. Пачалося нечуванае ўзвінчванне цэн за электраэнергію.

У 1926 годзе цана ўзрасла ўжо да 1 злотага. Гэта была рэкордная цана, якой не было нідзе ў Польшчы, апрача Беластока. Не дзіўна, што электрастанцыя ў сваіх штогодніх балансах паказвала па паўтара мільёны злотых фактычнага даходу, гэта значыць, суму, роўную ўсяму бюджэту Беластока ў першых гадах польскай улады.

Усё гэта праводзілася бессаромна яўна, на віду ва ўсіх. Магістрат атрымліваў ад Рыгерта пісулькі з загадамі, а пан бургамістр Шыманскі, лаўнікі Рыбаловіч і іншыя гэтыя загады выконвалі. Справа даходзіла да сапраўднай крымінальшчыны. Нават рэвізійная камісія, якая разглядала ў 1928 годзе дзейнасць магістрата, вымушана была падцвердзіць у сваім пратаколе:

«Магістрат у 1924 годзе не мог або не хацеў абараняць інтарэсы горада супроць канцэсіянераў электрастанцыі».

І не хацеў і не мог, бо пан Рыгерт плаціў пану Шыманскаму і іншым за грабеж насельніцтва. Гэта ні для каго ў горадзе не было сакрэтам. Калі пан Шыманскі ў 1928 годзе перастаў, нарэшце, быць бургамістрам Беластока, пан Рыгерт прадаставіў яму пасаду галоўнага бухгалтара электрастанцыі. Апошні не пасароміўся заняць гэты пост. Ён атрымліваў за сваю плённую працу па 1.200 злотых у месяц. Гэта былі юдавы грошы пана Шыманскага, які прадаў бельгійскаму капіталу 100 тысяч жыхароў Беластока.

Справы вадаправодныя

У той час, калі бургамістр Шыманскі асабліва цікавіўся электрастанцыяй, старшыня гарадской рады пан Філіповіч «спецыялізіраваўся» па справах вадаправода. Гэта ён правёў у гарадской радзе рашэнне аб 100-процантным павышэнні цэн на ваду. Гэты новы падатак на насельніцтва матывіраваўся неабходнасцю пабудаваць новую ваданапорную вежу, якая, зразумела, павінна была застацца ўласнасцю горада.

І на самай справе, новая вежа была пабудавана, але... уласнасцю горада яна ніколі не стала. Аказваецца, пан прэзес Філіповіч «забыў» уставіць адпаведны артыкул у дагавор з вадаправодам. Трэба, аднак, дадаць, што ў даным выпадку памяць падвяла не толькі пана прэзеса. Таксама забыў аб гэтай «дробязі» увесь магістрат — пан бургамістр Шыманскі, лаўнік інжынер Рыбаловіч і іншыя. Гэтая эпідэмія забывання тлумачыцца вельмі проста: пан Рыбаловіч быў тады загадчыкам вадаправода, а пан Філіповіч стаў яго загадчыкам у 1928 годзе і астаўся на гэтым пасту аж да апошніх дзён. Гэта была нядрэнная пасада. Работы — ніякай, а аклад — 800 злотых у месяц і 3 тысячы ў год на «рэпрэзентацыю».

Пан Філіповіч меў і іншыя справы на сваім сумленні. Старыя жыхары горада памятаюць цёмную справу з брукаваннем вуліц у 1926 годзе.

Пан Філіповіч лічыў сябе дэмакратам, і гэта быў на самай справе вельмі ліберальны чалавек, дэвізам якога было: жыві і дай жыць іншым. Калі яму даносілі, што члены гарадской рады і магістрата крадуць або бяруць хабар, ён ліберальна закрываў вочы. Вось характэрнае пісьмо, адрасаванае да пана прэзеса Філіповіча (знойдзена ў прэзідыуме гарадской рады).

«Да пана прэзеса гарадской рады горада Беластока.

Я неаднаразова гаварыў пану аб тым, што радныя (члены гарадской рады) Васілеўскі і Годынскі вымагаюць хабар ад гарадскіх падрадчыкаў пры дастаўках і пакупках для магістрата.

У першай палове лютага 1925 года я ізлажыў гэта пісьмова і ўказаў заслугоўваючага давер'я сведку пана В. Чаркоўскага, пражываючага на Палескім вакзале (чыгуначны лесапільны завод). Пан прэзес не паверыў, аднак, праўдзівасці справы і майго пісьмовага паказання не ўзяў...

Канапінскі».

Каментарыі, як гавораць, не патрэбны.

Пагромшчык, хуліган і п'яніца

Цёмным тыпам быў Францішак Беганскі, член фракцыі пілсудчыкаў, а затым — звязда беластоцкіх эндэкаў.

У 1919 годзе, калі польскія войскі ўвайшлі ў Беласток, яўрэі складалі большасць гарадскога насельніцтва. Была «небяспека», што і ў гарадской радзе акажацца яўрэйская большасць. Гэта было не па душы новым гаспадарам горада. «Мы не можам згадзіцца на тое, каб аб польскасці нашага горада, аб яго сучаснай і будучай культуры рашала яўрэйская большасць. Аб лёсах і гаспадарцы польскага Беластока можам рашаць толькі мы, палякі»,—пісаў польскі напыяналістычны друк. Для стварэння польскай большасці да горада быў далучан рад навакольных вёсак, нават вельмі далёкіх ад Беластока.

Насельніцтва гэтых вёсак не хацела належаць да горада, баялася падаткаў і т. д. Але кулакі, вясковыя гандляры і іншыя хутка зразумелі, што выбары з'яўляюцца прадметам спекуляцыі не менш карыснай, чым гандаль маслам і свіннямі.

Тыповым прадстаўніком гэтых спекулянтаў быў «селянін» Францішак Беганскі — кулак, які займаўся звозам пяску. У 1934 годзе ў якасці прадстаўніка прадмесцяў ён кандыдат па спіску пілсудчыкаў. Яго выступленні ў гарадской радзе хутка прыцягваюць да яго ўсеагульную ўвагу.

Гэта былі самыя хуліганскія чорнасоценныя прамовы, якія калі-небудзь гаварыліся ў Польшчы. Беганскі не быў вычурным прамоўцай. Ён гаварыў вельмі прымітыўна і заўсёды на адну тэму: аб жыдах. Не гледзячы на тое, якое пытанне стаяла на павестцы дня, Беганскі зводзіў справу да яўрэяў і даходзіў да самых дзіўных вывадаў. Разглядалася, напрыклад, пытанне аб недастатковым асвятленні вуліц Беластока. Беганскі падымаецца на трыбуну і прапануе ліквідаваць электрычнае святла на Купецкай вуліцы, бо там жывуць амаль выключна «жыды». Хтосьці з трыбуны гарадской рады скардзіўся на збіванне дзяцей у школах некаторымі настаўнікамі. Беганскі гаворыць прамову аб тым, што трэба збіваць усіх яўрэйскіх дзяцей. Ён адкрыта заклікаў з трыбуны да пагромаў і ставіў свае прапановы на галасаванне. Яго выступленні звычайна канчаліся пагромніцкімі дзеяннямі яго прыхільнікаў, якія ў час пасяджэнняў запаўнялі галёрку. На мітынгах, арганізаваных камітэтам для барацьбы з комунізмам (на чале гэтага камітэта стаяў намеснік бургамістра Беластока, пан Пятроўскі), Беганскі выступаў за ўвядзенне смяротнай кары за комуністычную дзейнасць.

Хуліган і пагромшчык Беганскі быў да таго-ж і горкім п'яніцай. Ноччу можна было сустрэць яго разам з эндэкамі Серватка і Буткевічам у шынках і іншых начных дамах Беластока.

Гандляры рысам, рэлігіяй і інтарэсамі народа

Яўрэйскія фабрыканты па розных прычынах вельмі рэдка ўваходзілі асабіста ў гарадскую раду. Яны праводзілі сваю палітыку праз людзей, звязаных з імі сямейнымі, асабістымі ці іншымі ніцямі. Гэта было куды больш спакойна і карысна.

У гарадской радзе 1934—1939 гг. быў толькі адзін фабрыкант — Хаім Герц (фірма Герц і Глікфельд), ён-жа дырэктар крэдытнага таварыства. Членамі былі адвакаты Тэсфес і Варшаўскі, звязаныя сямейнымі вузамі з вядомымі фабрыкантамі Пачэбуцкімі і Цытронамі. З фабрыканцкай сям'і паходзіў таксама член рады Гендлер, сакратар банка і прадстаўнік саюза домаўладальнікаў. Наогул, саюз домаўладальнікаў меў у гарадской радзе 1934—1939 гг. 5 прадстаўнікоў буйных домаўладальнікаў, багацеяў.

Яўрэйская буржуазія, пакуль гэта было магчыма, усямерна падтрымлівала пануючую ў гарадской радзе кліку пілсудчыкаў. Яўрэйскія фабрыканты і купцы адчувалі сябе вельмі добра пад крыллямі пілсудчыкаў — да таго часу пакуль не быў створан Озон з яго ярка выражанай антысеміцкай установкай.

Чалавекам, які звязваў яўрэйскую буржуазію Беластока з урадавымі коламі, быў нейкі Майсей Швіф, закулісны дзеяч саюза яўрэйскіх купцоў, член гарадской рады ў 1927—1934 гг. Ён быў цесна звязан з сеймавым паслом Вісліцкім, якому належаў рысаачышчальны завод у Гдыні (адзіны ў Польшчы), і ён дыктаваў цэны рысу на польскім рынку. Швіф быў прадстаўніком гэтага прадпрыемства па Беластоку і праводзіў тут палітыку Вісліцкага. Апрача таго, Швіф быў старшынёй банка прамысловасці і гандлю ў Беластоку. На гэтым пасту ён растраціў буйныя сумы, але яго высокія апякуны замялі гэтую справу, а амерыканскія філантропы дапамаглі банку зноў стаць на ногі.

Тыповым прадстаўніком рэакцыйнай, рэлігійнай часткі яўрэйскай буржуазіі, так званай «агуды», быў дырэктар яўрэйскай гімназіі Тылеман. Родам ён быў з Галіцыі. Юнаком, без грошай і сувязей, ён паявіўся ў Беластоку. Хутка зразумеў, што лепш за ўсё ў даных абставінах прыкінуцца рэлігійным. І ён не памыліўся. Ён уваходзіць у састаў усіх рэлігійных яўрэйскіх установ Беластока, становіцца дзеячом яўрэйскай абшчыны і, нарэшце, трапляе ў гарадскую раду.

Кар'ера яго забяспечана. Ён стварыў разам з адвакатам Жэмельскім урадавую яўрэйскую арганізацыю, разбагацеў, пабудаваў сабе асабнячок па Фабрычнай вуліцы, стаў адным з кіраўнікоў яўрэйскай буржуазіі Беластока.

Усе яўрэйскія члены гарадской рады былі палітыканамі, гандлюючымі сваім народам, рысам і рэлігіяй.

Так званыя „соцыялісты“

Гэта было яшчэ да прыходу Чырвонай Арміі. У 10 гадзін раніцы, у кафэ «Люкс», дзе збіралася шыкарная буржуазная публіка, уваходзіў штодзённа высокі пан у шубе і садзіўся за адзін з столікаў піць кофе з пірожным. Усе навакол вітаюцца з ім, усе добра яго ведаюць. Да яго століка прысаджваюцца фабрыканты, купцы. Гэта — Вакс, правадыр беластоцкай арганізацыі Бунда, кіраўнік бундаўскай фракцыі ў гарадской радзе.

Вакс быў калісьці дырэктарам фабрыкі Яноўскага, а затым Трылінга. Пасля смерці бацькі, які быў агентам страхавога таварыства «Пяст», бундавец Вакс заняў яго месца. Усе беластоцкія прамыслоўцы страхавалі свае фабрыкі пры пасрэдніцтве главара Бунда Вакса. Гэта была вельмі прыбытковая справа. Фабрыканты страхавалі свае драўляныя будоўлі на сотні тысяч злотых кожны. Пажары фабрык былі ў капіталістычным Беластоку вельмі частай з'явай, яны гарэлі штогод. Гарэлі таму, што не было адпаведнай проціпажарнай аховы і таму... што гэта было карысна фабрыкантам. Гэта было карысна і Ваксу. Фабрыканты атрымлівалі страхавыя сумы, бундавец Вакс атрымліваў проценты ад гэтых сум. А рабочыя спаленых фабрык трацілі работу.

У асяроддзі прамыслоўцаў і купцоў Вакс лічыўся сваім чалавекам. Не цяжка зразумець, што ён жыў са сваімі кліентамі ў найлепшых адносінах. Ад гэтага залежала яго матэрыяльнае становішча. Зразумела, што гэты элегантна апрануты, спакойны, ураўнаважаны пан з прыемнымі манерамі ненавідзеў усялякія канфлікты, забастоўкі і таму падобныя «выбрыкі»» рабочых, а комуністаў лічыў злейшымі ворагамі рабочага руху. Вакс займаў пазіцыю на крайне правым крыле Бунда. Ён не ўмешваўся ў дробязі штодзённай палітыкі, выступаў рэдка, толькі ў важных выпадках, па буйных палітычных пытаннях. Гэта быў «тэарэтык» беластоцкага Бунда.

Пэпээсаўцы ў гарадской радзе ніколі вялікай ролі не ігралі. Рабочыя ненавідзелі паноў капітулкаў, рэгінеляў, марцінякоў і не выбіралі іх у гарадскую раду. У выбарах 1939 г. пэпээсаўцы ўставілі ў свае спіскі некалькі левых рабочых, разлічваючы, што такім чынам падымуць свае шансы. У гэтым яны не памыліліся—рабочыя аддалі свае галасы на спіскі ППС і профсаюзаў, але пры гэтым перакрэслівалі прозвішчы вядомых важакоў ППС. Лёгка прадставіць сабе роспач і адчай пэпээсаўскіх палітыканаў, калі аказалася, што ні адзін з іх не выбран у гарадскую раду: рабочыя выбралі дэпутатамі трох левых і трох радавых членаў ППС. Капітулка з адчаю піў некалькі дзён і амаль не памёр з перапою.

* * *

Напярэдадні выбараў у першы Беластоцкі гарадскі Совет дэпутатаў працоўных мы напомнілі працоўным Беластока некаторых былых «бацькоў» горада і паказалі іх сапраўдны твар. Спіс гэтых нікчэмных тыпаў можна было-б прадоўжыць, але і паказаных хопіць, каб адлюстраваць і зразумець, чым былі «дэмакратычна» выбраныя гарадскія рады, чым з'яўляецца наогул дэмакратыя пры панаванні капітала.

Жалезнай мятлой вымела совецкая ўлада ўсіх гэтых прадажных палітыканаў, лоўкіх кар'ерыстаў і проста злодзеяў. Назаўсёды абарвалася ніць бліскучай кар'еры розных паноў шыманскіх і беганскіх, швіфаў і віксаў. Насельніцтва Беластока пазбавілася, нарэшце, пана Рыгерта і ўжо не плоціць яму і яго бельгійскім гаспадарам мільёнаў працоўных грошай. Яно пазбавілася назаўсёды фінансістаў, прамыслоўцаў, фабрыкантаў, купцоў і іх юрыс-консультаў, дырэктараў і чыноўнікаў, якія на працягу столькіх год высмоктвалі ўсе сокі з працоўнага народа, абкрадалі яго і здзекваліся над ім.

Параўнанне былых «радных» і «лаўнікаў» з вылучанымі народам кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых Советаў дэпутатаў працоўных паказвае, што толькі зараз, толькі ва ўмовах соцыялізма ажыццяўляецца сапраўдная дэмакратыя і народ можа пасылаць у органы сваёй улады сваіх сапраўдных прадстаўнікоў.

М. Навагрудскі.



Чытальны зал Беластоцкай абласной бібліятэкі ім. Горкага.
Фота А. Сапіра.

ТЭАТР

„4 дні" (Юліс)

«5 студзеня напэўна выпадзе першы снег. Польскія легіёны цяжкімі ботамі стопчуць гэты снег, які стане чорным і брудным. А я, з палаючым сэрцам, маладымі рукамі зніму са снегу бруд і шырока адкрытымі вачыма буду шукаць слядоў шасці комунараў.»

Такім уступам распачаў сваю кніжку «Юліс» малады віленскі хлапчук Даніэль. Гэта было ў дзесятую гадавіну апісаных ім падзей, якія мелі месца ў Вільні на працягу 4 дзён. Адсюль і назва драмы.

1 студзеня 1919 года немцы адступалі з Вільні. Паўстала пытанне, хто возьме ўладу ў горадзе. Сабіраецца совет, у склад якога ўваходзяць прадстаўнікі ППС, Бунда і комуністы. Комуністы дамагаліся далучэння горада да Соцыялістычнай Совецкай рэспублікі, бундавец гаворыць, што рэволюцыю нельга прыносіць на штыках, а пэпэсавец проста здраджвае. За грошы абшарнікаў і фабрыкантаў арганізуецца легіён, які разганяе дэманстрацыю.

Комуністы высылаюць свой баявы атрад на спатканне выкліканых з Мінска на дапамогу таварышоў, а самі астаюцца ў горадзе з малой групай старых салдат, змучаных 4-гадовай вайной. Польскія легіянеры займаюць горад. Дапамога з Мінска прышла са спазненнем. Былі забіты чатыры комунары: Юліс Шымелскі, Станіслаў Браноўскі, Людвіг Янкоўскі і Якуб Ас (Марат).

Вось уся гісторыя «4 дзён», якую само жыццё ўзбагаціла фактамі.

П'еса дакладна трымаецца назвы. Яна паказвае сапраўды апошнія 4 дні герояў. Але нічога не гаворыць аб іх мінулым, кім яны былі, што перажывалі, і гэта прадстаўляе значную цяжкасць для артыстаў. Выключэннем з'яўляюцца Людвіг і Анна, а ў некаторай меры і Ас. Гэтыя вобразы распалагаюць больш значным драматургічным матэрыялам і таму даюць артыстам магчымасць глыбей раскрыць сутнасць вобразаў. Гэта таленавіта выкарыстаў артыст Нісенцвейг, які іграе ролю Людвіга.

Вобраз Якуба Аса (Марат) дае вялікія магчымасці для артыста. Аўтар прадстаўляе яго мысліцелем, а ў інтэрпрэтацыі артыста ён паўстае псіхічна-ненармальным, абросшым грузчыкам.

Артыст Грудберг (выканаўца Юліса), на жаль, не паказаў баявога выгляду аднаго з комунараў. Юліс у яго інтэрпрэтацыі мягкі, рэзанёрскі і зусім не напамінае чалавека, які ў час працэсу страляў у старшыню суда. У спектаклі Юліс не вылучаецца, хоць і з'яўляецца галоўным героем п'есы, якая носіць яго імя. Вылучаецца-ж Станіслаў, які стварае вакол сябе атмасферу дзеяння. Станіслава іграе артыст Марэўскі.

Разачароўвае ігра артысткі Літон, якая іграе Анну. У яе расказе аб каханні зусім няма настрою. Гэтую сцэну трэба было-б скараціць, адкінуць некаторыя падрабязнасці і тады, можа, яна дайшла-б да гледача.

Цяжкія ролі бундаўца (Давідсон) і пэпээсаўца (Ліпман) артыстам удалося добра выканаць. Кожны з іх атрымлівае сваё выражэнне на фоне другога. Гэта цікавы прыём рэжысёра.

Пераходзячы да рэжысёра, трэба адзначыць, што ён меў цяжкую задачу. Трэба было стварыць мінулае дзейнічаючых асоб, падняць п'есу на ўзровень гераічнай драмы, даць ёй заканчэнне, падкрэсліць барацьбу комуністычнай партыі і здраду ППС і Бунда, уцягнуць масу ў падзеі.

У п'есе былі зроблены спробы ўцягнуць масу. На жаль, не відаць рытму жыцця гэтай масы ні на сцэне ні за сцэнай.

Людвіг Шар.

У творчым самаўглыбленні

Гэта адносіцца да праблемы невырашальнага трагізма: актор хоча паглядзець, як ён іграе сваю ролю.

Расказваюць аб славутым акторы Шумскім. Першы выканаўца Аркашкі ў «Лесе» Астроўскага замест таго, каб выйсці на сцэну ў адпаведную мінуту, загрыміраваны і апрануты, адправіўся на галёрку паглядзець... як ён іграе: сышоў з ума.

Іграць—значыць гарэць, жыць у пече трапыхаючага сэрца, у дрыжанні нацягнутых струн яго. А ізабражаць значыць адначасова глядзець на сябе, халодна авалодваць уласным захапленнем і падпарадкоўваць творчаму плану свой малейшы капрыз.

Наш новы спектакль прадстаўляецца мне ў гэтым сэнсе з'явай, падобную якой я не памятаю за 35 год свайго сцэнічнага шляху. За першы совецкі год мы адну совецкую п'есу аднавілі і адну нанава паставілі. Але толькі ў рабоце над «Чатырмя днямі» мы з галавой акунуліся ў совецкае мастацтва. Два рэжысёры — М. Е. Віскінд і І. М. Міндлін—прадстаўнікі двух светаў і па сцэнічнай школе, і па ўзросту, і па метадах, з супроцьлеглых канцоў шукалі стыль і мэту спектакля.

У спектаклі «4 дні» я іграю Станіслава Бранеўскага, рабочага, комуніста, які 40 год працаваў ва ўсіх друкарнях Польшчы. Усім сэрцам ён адчуваў, што так званыя «соцыялісты» з гандляроў і памешчыкаў прададуць справу рабочага класа. Поўны пяшчотнасці да дзяцей і таварышоў, ён кіпіць нянавісцю да тых, хто прымазваецца да рэволюцыі і рыхтуе ёй здраду і пагібель. Станіслаў—свядомы рабочы, які сваім чуццём разумее, што свабода яго радзімы, сапраўднае вызваленне Польшчы ад ярма—гэта справа ўсеагульнага вызвалення працоўных. Словы аб свабодзе Польшчы на вуснах ворага—пэпээсаўца Багуслаўскага здаюцца Станіславу «простай балбатнёй». Станіслаў жыве, як сапраўдны баец рэволюцыі і, як баец, без позы прымае смерць.

Такі мой Станіслаў.

А. Марэўскі,
артыст і рэжысёр Яўрэйскага тэатра.

Мой шлях да Юліса

Гэта пачалося год 5 таму назад. Сярод літаратуры, якую мы нелегальна атрымлівалі ў Варшаве, я знайшоў кніжку Даніэля «4 дні» (Юліс). Мая акторская фантазія разгарэлася ў захапленні велічным вобразам героя-большэвіка Юліса Шымелскага. Але гэта была фантазія, мара, якая не магла ажыццявіцца ва ўмовах буржуазнага рэжыму.

Калі год таму назад я быў пазбаўлен ад жахаў імперыялістычнай вайны і прышоў на свабодную совецкую зямлю, кніжка зноў трапіла ў мае рукі. Зноў ажыў для мяне Юліс, ён стаў яшчэ бліжэй і даражэй, бо я мог вольна дыхаць яго думкамі, мог бачыць ажыццёўленымі тыя мары, за якія Юліс аддаў сваё жыццё.

І не раз, калі ў дні свайго «бежанства» я крочыў па вуліцах Беластока, я сустракаў багуслаўскіх, раулей, фуксаў. За мной нязменна ішоў Юліс і саграваў мяне сваім шынелем. Чытаючы творы нашых правадыроў, я думаў: як-бы іх чытаў Юліс. Вывучаючы гісторыю партыі, я думаў, як паступіў-бы Юліс у тым ці іншым выпадку.

Юліс быў для мяне ўвасабленнем жалезнага большэвіка, ідэальнага байца ленінска-сталінскай гвардыі, сапраўдным прадстаўніком пролетарскага авангарда. І калі мне панучылі ролю Юліса, я быў бясконца рады: збыліся мае мары, я-ж доўга выношваў Юліса ў сабе. Перада мной была задача: акторскі перадаць тое, што стольні год я думаў аб Юлісе. Ці ўдалося мне гэта—няхай мяркуе глядач.

Ісак Грудберг,
артыст яўрэйскага тэатра.

ІТАЛА-ГРЭЧАСКАЯ ВАЙНА

Амерыканскія паведамленні

НЬЮ-ЙОРК, 23 лістапада. (ТАСС). Паводле паведамленняў амерыканскага друку, перадавыя часці грэчаскіх войск уступілі ўчора ў 5 гадзін па мясцоваму часу ў Корчу. Галоўныя сілы падышлі да горада толькі пасля 4 гадзін.

Пры адступленні італьянцы вывезлі з Корчы значныя ваенныя запасы. Грэчаская кавалерыя і браніраваныя аўтамабілі праследуюць адступаючыя часці на паўночны захад ад горада. Сярод італьянцаў, якія трапілі ў палон к грэкам на фронце Корчы, знаходзіцца генерал Жаніні.

Праз некалькі гадзін пасля таго, як грэкі занялі Корчу, італьянскія самалёты падверглі горад інтэнсіўнай бамбардыроўцы.

Грэчаскай кавалерыяй занята ўшчэльле ў раёне гары Морава. Івангара, дзе грэкам здаўся італьянскі перадавы пост.

Грэкі працягваюць наступленне на Паградзец і возера Охрыда.

Горная артылерыя беспярэпынна абстрэльвае дарогу Корча — Паградзец. Захоплена два танкі, адна цяжкая гармата, 13 кулямётаў і 9 грузавікоў з боепрыпасамі. Тры англійскіх бамбардыроўшчыкі зрабілі налёт на Паградзец, выклікаўшы ў горадзе пажары, а таксама бамбардыравалі войскі і аўтатранспарт італьянцаў на захад ад Эльбасана. Грэкі захапілі гору Звязда, хаця італьянцы яшчэ працягваюць утрымліваць на ёй некаторыя пазіцыі. Адзін італьянскі батальён у 800 чалавек перайшоў паблізу Стэнье югаслаўскую граніцу і быў раззброен.



—о—

Ваеннае становішча ў Турцыі

АНКАРА, 23 лістапада. (ТАСС). Анаталійскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: «Савет міністраў выдаў дэкрэт аб увядзенні ваеннага становішча ў Турцыі тэрмінам на адзін месяц у вілайетах: Стамбульскім, Куркларэлі, Эдырне, Тэкірдаг, Чанакале і Каджаэлі».

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 23 лістапада. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне паведамляе: У ноч на 22 лістапада германская авіяцыя працягвала свае аперацыі супроць Лондана і зноў прадпрыняла налёты на Бірмінгам, Кавентры, Брыстоль і Саутгемптон. Удзень працягваліся налёты на Лондан, Брайтон і іншыя важныя ў ваенных адносінах аб'екты. У Цэнтральнай Англіі бомбы былі скінуты на некалькі аэрадромаў. У ангарах і сховішчах узніклі пажары. Моцнай бамбардыроўцы падвергліся таксама чыгуначныя збудаванні ў Паўднёва-Усходняй Англіі і каля Лінкольна.

На моры германская авіяцыя прычыніла цяжкія пашкоджанні двум грузавым суднам. Англійскія самалёты ў ноч на 23 лістапада зноў падвергні бамбардыроўцы жылыя кварталы ў Заходняй Францыі і Заходняй Германіі. Узнікшыя пажары былі хутка ліквідаваны. Забіта 7 і ранена каля 20 чалавек. Збіт адзін англійскі бамбардыроўшчык; германская авіяцыя таксама страціла адзін самалёт.

БЕРЛІН, 23 лістапада. (ТАСС). Як перадае германскае інфармацыйнае бюро, учора ўвечары германская авіяцыя зрабіла з вялікім поспехам новы налёт на Бірмінгам. У горадзе пачаліся пажары. Нарушан рух транспарта. Многа заводскіх памяшканняў разбурана.

У час налёту, у ноч на 23 лістапада, у Бірмінгаме былі скінуты бомбы ўсіх калібраў на ваенныя заводы, якія яшчэ не пацярпелі ад папярэдніх бамбардыровак. Каб затрудніць дзеянні англійскай зенітнай артылерыі, шпапады асобных бамбардыроўшчыкаў змяняліся атакамі буйных злучэнняў. У час гэтага налёту ўпершыню ў масавым маштабе бомбы скідваліся з брэюшага палёту. Учора пасля поўдня германскія дальнабойныя гарматы абстралялі важныя ваенныя аб'екты, размешчаныя на паўднёвы ўсход ад Лондана.

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 23 лістапада. (ТАСС). Міністэрства авіяцыі паведамляе, што ў ноч на 23 лістапада англійскія самалёты падвергнулі бамбардыроўцы рад аб'ектаў Германіі.

Непрыяцельская авіяцыя скінула ўчора бомбы на вёску аднаго з суседніх з Лонданам графстваў і адзін з гарадоў паўднёва-ўсходняга ўзбярэжжа Англіі. Пашкоджаны жылыя дамы. Колькасць ахвяр невялікая. Збіта два германскія бамбардыроўшчыкі.

У ноч на 23 лістапада германскія самалёты скінулі бомбы ў заходняй частцы Цэнтральнай Англіі. Разбурана многа будынкаў. Ёсць забітыя і раненыя. Узнікла многа пажараў, якія былі хутка ліквідаваны. Налёт на Лондан і гарады ў даліне ракі Мерсей і Паўднёвай Англіі не прычыніў значнага ўрону. Колькасць ахвяр таксама невялікая.

ЛОНДАН, 23 лістапада. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае, што англійскія самалёты, раскідваючыя міны ў тэрытарыяльных водах праціўніка, пакрылі за час сваіх аперацый каля 1 мільёна міль. Авіяцыя раскідвала міны ў Паўночным моры, праліве Ла-Манш, у Атлантычным акіяне, у пралівах Катэгат і Скагерак і нават у Кільскім канале.

Учора раніцой самалёты англійскай берагавой абароны зрабілі налёт на аэрадром у Ставангары. Бамбардыроўка выклікала некалькі пажараў і ўзрываў.

Англійскія рабочыя патрабуюць павышэння заработнай платы

ЛОНДАН, 23 лістапада. (ТАСС). Пяць англійскіх трэд-юніёнаў, прадстаўляючых адзін мільён 300 тысяч рабочых, занятых у галінах прамысловасці, звязаных з абароннай краіны, прад'явілі міністру унутраных спраў і унутранай бяспекі Марысону патрабаванне павышэння заработнай платы на 10 шылінгаў у тыдзень. Яно было высунута ўслед за аналагічным патрабаваннем трэд-юніёнаў, прадстаўляючых чыгуначнікаў, шахцёраў і рабочых, занятых у суднабудаўнічай і машынабудаўнічай галінах прамысловасці. Такім чынам, павышэння заработнай платы патрабуюць звыш 5 мільёнаў рабочых.

Заява прэм'ер-міністра Егіпта

ЛОНДАН, 23 лістапада. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае з Каіра, што новы егіпецкі прэм'ер Хусейн Суры паша у інтэрв'ю, даным карэспандэнту газеты «Дэйлі тэлеграф энд морнінг пост», заявіў: «Егіпет мае договар з Англіяй і будзе строга прытрымлівацца гэтага дагавора. Перадайце гэта ўсяму свету, і няхай ні ў кага не астанецца ілюзій адносна пазіцыі Егіпта».

Адказы Рузвельта на пытанні прадстаўнікоў друку

НЬЮ-ЙОРК, 23 лістапада. (ТАСС). Як перадае агенцтва Юнайтэд Прэс, адказваючы на пытанні прадстаўнікоў друку, Рузвельт заявіў, што дапамога Англіі набліжаецца да максімальных размераў існуючых вытворчых магчымасцей ЗША. На пытанне, ці намераны ЗША павялічыць дапамогу Англіі ў сувязі з інтэнсіўнай бамбардыроўкай англійскіх гарадоў, Рузвельт адказаў, што далейшая дапамога Англіі залежыць ад расшырэння вытворчасці унутры ЗША.

ВАЙНА Ў БАСЕЙНЕ МІЖЗЕМНАГА МОРА І Ў АФРЫЦЫ

РЫМ, 23 лістапада. (ТАСС). Італьянскае камандаванне перадае: «На грэчаскім фронце нашы войскі рэгулярна робяць прадугледжаную перасоўку для заняцця новых пазіцый. Наша авіяцыя бамбардыравала войскі і многалікія аб'екты на пазіцыях праціўніка, галоўным чынам у сектары Корчы, разбураўшы пры гэтым дарогі.

У Паўночнай Афрыцы непрыяцельская авіяцыя зрабіла налёты на Бардыю і Дэрна; пашкоджанняў няма.

На Усходняй Афрыцы нашы самалёты бамбардыравалі аэрапорт Розеір, Порт-Судан і непрыяцельскія пазіцыі за Галабатам, дзе ўзнік вялікі пажар. У баях збіта тры самалёты праціўніка.

Англійская авіяцыя бамбардыравала Касала, дзе загарэўся шпіталь і бары».

ЛОНДАН, 23 лістапада. (ТАСС). Як афіцыяльна паведамляецца, англійская авіяцыя зрабіла ўчора паспяховы налёт на Тэпелене (Албанія). Разведкай над тэрыторыяй праціўніка здабыты каштоўныя весткі.

У ноч на 21 лістапада англійскія самалёты бамбардыравалі Бенгазі, Эль Берка і Беніна, дзе адзначаны прамыя пападанні ў некалькі будынкаў і казармы.

У Беніна было, магчыма, моцна пашкоджана многа самалётаў праціўніка, якія знаходзіліся на пасадачнай пляцоўцы.

ЛОНДАН, 23 лістапада. (ТАСС). Паводле паведамлення агенцтва Рэйтэр, адборныя часці грэчаскіх войск адназначна прасоўваюцца на Аргіракастрона. Учора авангардныя часці гэтых войск, прадпрыняўшы новую атаку, прымусілі непрыяцеля адступіць за Какаві.

—о—

Забастоўкі на ваенных заводах ЗША

НЬЮ-ЙОРК, 23 лістапада. (ТАСС). Газеты паведамляюць аб забастоўцы 7.500 рабочых на прадпрыемствах фірмы «Алюмініум компані оф Амерыка» каля Пітсбурга. У выніку спынілася вытворчасць алюмінія, які ідзе для ваенных самалётаў. Рабочыя патрабуюць прызнання прафсаюза.


Працягваецца забастоўка ўваходзячых у кангрэс вытворчых прафсаюзаў 5.200 рабочых на заводах кампаніі «Валтыць эйркрафт» у Паўднёвай Каліфорніі. Забастоўка затрымлівае вытворчасць трэніровачных самалётаў для амерыканскай арміі, а таксама знішчальнікаў для Англіі.

Учора ў Сіракузах (штат Нью-Йорк) на заводах кампаніі «Крусібл сцыл» скончылася трохдзённая забастоўка 2.300 рабочых прафсаюза сталеліцейнай прамысловасці, уваходзячага ў Кангрэс вытворчых прафсаюзаў. Кампанія згадзілася пачаць перагаворы аб павышэнні зарплаты і аб паляпшэнні ўмоў працы.

ХРОНІКА

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР назначыў Намесніка Народнага Камісара Замежных Спраў Дэканозава В. Г. Паўнамоцным Прадстаўніком СССР у Германіі.

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР вызваліў Шкварцава А. А. ад абавязкаў Паўнамоцнага Прадстаўніка СССР у Германіі.



Новая друкарска-пачачная машына на беластоцкай табачнай фабрыцы, зробленая на ленінградскім заводзе імені Фрыдрыха Энгельса.

На здымку: вынаходца машыны тав. Мільнер абучае рабочых беластоцкай табачнай фабрыкі рабоце на ёй.

На дасягнутым не спынюся

На нашым заводзе шырока разгорнута соцыялістычнае спаборніцтва. Заключаны соцыялістычныя дагаворы паміж брыгадамі і рабочымі. У выніку гэтага завод выканаў план на 141 процант. На заводзе працую 16 год. Сюды я паступіў пры былым гаспадару Арлоўскім, працаваў тры годы, пакуль атрымаў адпаведную кваліфікацыю.

З прыходам Чырвонай Арміі я ўвесь час стараюся працаваць высокапрадукцыйна, з'яўляюся стаханаўцам. У абавязацельстве я даў слова выканаць заданне на 180 процантаў. Сваё слова я стрымаў і сістэматычна даю звыш двух з палавой норм. Толькі за кастрычнік я выканаў заданне на 250 процантаў і зарабіў 1.400 рублёў. Упершыню за ўсю гісторыю завода мы вытвараем алілўку і фармоўку дэталяў у 1.200 кілаграмаў.

Свой вопыт я перадаю майму вучню Ш. Кацу. Я ўзяў на сябе абавязацельства дапамагчы 4-м вучням стаць кваліфікаванымі рабочымі. Абавязуюся дасягнуць яшчэ лепшых паказчыкаў.

Л. Напюркоўскі,
стаханавец ліцейнага цэха Ломжынскага завода сельгасмашын.

У ІНДУРСКІМ ДОМЕ СОЦКУЛЬТУРЫ

Як толькі пачынае вечарэць, да будынка Індурскага дома соцыялістычнай культуры з усіх бакоў збіраюцца людзі: моладзь, старыя рабочыя, сяляне навакольных вёсак. Яны ведаюць, што змогуць тут культурна і весела правесці свой вольны ад работы час.

Круг дзейнасці Дома соцкультуры разнастайны. Тут часта праводзяцца лекцыі па гісторыі народаў СССР, якія чытае дырэктар няпоўнай сярэдняй школы, тав. Смірноў. Падзяжваюцца таксама лекцыі па геаграфіі, агратэхніцы, даклады аб міжнароднім становішчы. Пры доме ёсць спецыяльная скрынка, куды можна апускаць пытанні на любую тэму. Раз у тыдзень даюцца адказы на гэтыя пытанні.

На працягу апошніх двух месяцаў у Доме соцкультуры праведзена тры літаратурныя вечары па разбору творчасці беларускага пісьменніка Міхася Лынькова, паэтычнай сатыры Кандрата Крапівы, кнігі Ніканара Астроўскага «Як гартавалася сталь».

Шырокай папулярнасцю карыстаецца харавы гурток, у якім удзельнічае 46 чалавек.

Пры Доме соцкультуры ёсць бібліятэка і чытальня. У чытальню штодзённа прыходзіць 20 экземпляраў розных газет, а таксама журналы. У бібліятэцы налічваецца 3 тысячы экземпляраў кніг на рускай, беларускай, польскай і яўрэйскай мовах. Сярод кніг творы Леніна і Сталіна, «Капітал» Маркса, «Анты-Дзюрынг» Энгельса, а таксама кнігі Пушкіна, Горкага, Талстога, Чэхава, Некрасава, Янкі Купалы, Якуба Коласа і інш.

Зараз работа Дома соцкультуры пастаўлена на службу выбарчай кампаніі. Створан агітколектыў, які аб'ядноўвае 50 чалавек. Агітатары-комсамольцы тт. Лейнер, Сегал, Агуніна, Фур'е і іншыя карыстаюцца вялікім аўтарытэтам сярод выбаршчыкаў. Яны добра выхаваюцца да заняткаў, змястоўна і цікава іх праводзяць.

У Індурскім Доме соцкультуры ёсць чаму павучыцца астатнім ДСК нашай вобласці.

А.Салаўёў.

У соцыяльна-прававым кабінеце

Пры беластоцкім гарадскім аддзеле аховы здароўя працуе соцыяльна-прававы кабінет, які за час свайго існавання многа зрабіў па аказанню дапамогі мацеры і дзіцяці.

Сюды прыходзяць мацеры, якім судамі былой Польшчы было адмоўлена ў аплаце аліментаў. Грамадзянка С. на працягу сямі год безрэзультатна дабівалася аліментаў для дзіцяці ад яго бацькі нейкага Карчэўскага. Соцыяльна-прававы кабінет аднавіў справу супроць Карчэўскага, і для дзіцяці былі прысуджаны аліменты. Часта звяртаюцца ў кабінет многадзетныя мацеры. Юрыст кабінета дапамагае ім у афармленні дакументаў, неабходных для атрымання дзяржаўнай дапамогі маці на многадзетнасці.

Е. Гройвер.

Адказны рэдактар
Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16-10, эканамічнага аддзела—праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя—14-32.

УБ — 105. Тыраж 12.000 экз. Друкарня Беластокдрук.